# АЛЬТЭРНАТЫЎНЫ МЕТАД ГІСТАРЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ: ВУСНАЯ ГІСТОРЫЯ.

УДК 94 (476) Н.А. Поляк
установа адукацыі
Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь

***Вусная гісторыя*** (oralhistory) – запісаныя на відэа ці аўдыё стужку ўспаміны аб мінулым яго сведкаў. Гэта дастаткова новы накірунак гістарычнай навукі, які ў Беларусі толькі пачынае набіраць папулярнасць. Вусная гісторыя бачыцца альтэрнатыўным і мадэрновым метадам гістарычныга даследавання таму што:

-стварае новыя крыніцы і матэрыялы, якія не магчыма атрымаць іншым спосабам, захоўвае сведчанні "маленькіх людзей", якія адчувалі на сябе пэўныя гістарычныя падзеі;

-дазваляе скарэкціраваць дадзеныя, якія ўтрымліваюць архіўныя матэрыялы;

-дае магчымасць "апрабіраваць" завярэнні афіцыйных канцэпцый;

- прадстаўляе матэрыял для іншых галін соцыа-гуманіраных навук (культуралогія, дыялекталогія, этнаграфія, псіхалогія і інш);

- аднаўляе страчаныя традыцыі і забяспечвае сувязь пакаленняў, перадае семантычны код народа;

- дапамагае зразумець, што гісторыя творыцца намі самімі, а гэта крок да фарміравання адказнасці перад нашчадкамі і абуджэння сапраўдных глыбінных патрыятычных пачуццяў.

Асноўнай формай збору матэрыяла з'яўляецца інтэрв'ю. Пры гэтым запіс размовы абавязкова вядзецца на дыктафон, або здымаецца на відэа. Неабходна скласці пашпарт рэспандэнта (прозвішча, месца і год нараджэння, пол), усталяваць добры эмацыянальны фон размовы ("разгаварыць" рэспандэнта), патлумачыць значнасць і каштоўнасць успамінаў.

Праводзячы аналіз вуснагістарычных крыніц, неабходна ўлічваць: высокую ступень суб'ектыўнасці матэрыяла, уплыў гендэрных і нацыянальных фактараў, жаданне разказчыка "павучыць маладое пакаленне", уздзеянне афіцыйнай ідэалогіі, калі інфармацыя з СМІ выдаецца за свае ўспаміны, небяспека кіравання карэспандэнтам ходам размовы, якое адводзіць разказчыка ў бок.

Дадзеныя вуснай гісторыі дапамагаюць рэканструіраваць падзеі мінулага, дапаўняючы яго "гісторыяй знізу". Дазваляюць зразумець уздзеянне дзяржаўнай палітыкі ў эканамічнай і культурнай сферы на людзей. Часам дае адказы на пытанні якія цікавілі гісторыкаў доўгі час.

У выніку можна адзначыць, што такі новы накірунак гістарычнага даследавання як вусная гісторыя з'яўляецца паўнавартасным спосабам аднаўлення мінулага нашай краіны і садзейнічае абуджэнню цікавасці да гісторыі.

Обсуждено и одобрено на заседании кафедры
Протокол от . .20 №

Начальник кафедры
социальных наук В.А. Ксенофонтов